# ПРЫМЕТНІК

## СТУПЕНІ ПАРАЎНАННЯ

# АРФАГРАФІЧНАЯ ХВІЛІНКА

## Спішыце, устаўляючы літары
## е, ё, я.

Б..склапотны, ф..льетон, сп..вак, с..мнаццаты, н..здарма, б..дняк, б..дната, дэл..гацыя, п..рсцёнак, запав..дзь, з..лкі, м..сці, кал..ндар, выгл..д, б..нзін.

# АРФАГРАФІЧНАЯ ХВІЛІНКА

## Праверым напісанае

Бесклапотны, фельетон, спявак, сямнаццаты, нездарма, бядняк, беднота, дэлегацыя, пярсцёнак, запаведзь, зёлкі, месці, каляндар, выгляд, бензін.

# АДРОЗНЕННЕ ЯКАСНЫХ ПРЫМЕТНІКАЎ АД АДНОСНЫХ

| якасныя прыметнікі | адносныя прыметнікі |
| --- | --- |
| • **маюць** ступені параўнання (*лёгкі – лягчэйшы, найлягчэйшы*);<br>• **спалучаюцца** са словамі *вельмі*, *надта* (*вельмі карысны*);<br>• **могуць быць** невытворнымі (*смелы*) і вытворнымі (*страшны*) словамі | • **не ўтвараюць** форм ступеней параўнання;<br>• **не спалучаюцца** са словамі *вельмі*, *надта*;<br>• вытворныя словы (*дажджавы, сённяшні*) |

# СТУПЕНІ ПАРАЎНАННЯ ЯКАСНЫХ ПРЫМЕТНІКАЎ



# ЯКАСНЫЯ ПРЫМЕТНІКІ, ЯКІЯ НЕ ЎТВАРАЮЦЬ СТУПЕНЯЎ ПАРАЎНАННЯ

- прыметнікі, якія абазначаюць нязменныя якасці (*глухі*, *сляпы*, *жанаты*)
- прыметнікі, якія абазначаюць масці жывёл (*буланы*, *гняды*)
- прыметнікі, якія абазначаюць колер прадметаў праз адносіны да іншых прадметаў (*бронзавы*, *вішнёвы*)
- складаныя прыметнікі (*цёмна-зялёны*, *шэравокі*)

# УТВАРЭННЕ ПРЫНАЛЕЖНЫХ ПРЫМЕТНІКАЎ

**ад асноў адушаўлёных назоўнікаў жаночага роду**

- суфіксы **-ін-**, **-ын-** (*Ірын**ін**, матч**ын***)

**ад асноў адушаўлёных назоўнікаў мужчынскага роду**

- суфіксы **-аў- (-ав-)**, **-оў- (-ов-)**, **-еў- (-ев-)**, **-ёў- (-ёв-)** (*Кастус**ёў**, дзядзьк**ав**а*)